Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 САКАВІКА 2008 г. АЎТОРАК
№ 42 (26155)
Кошт 430 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## ПЕНСІЙНАЯ ТЭМА: ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ?



Вылічэнне стажу і каэфіцыенту, магчымасць пераходу з аднаго віду пенсіі на іншы, ільготы «датэрміноўшчыкам», змяненні ў пенсійным заканадаўстве — усё гэта стане тэмамі чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Бікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» будзе праходзіць **11 сакавіка з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія званкі прымаюцца па нумары 287 17 57.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дзмітрыя Мядзведзева з перамогай на выбарах прэзідэнта Расіі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дзмітрыя Мядзведзева з перамогай на выбарах прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.**

«Падтрымаўшы Вас, расійскія выбаршчыкі выказаліся за прадаўжэнне стваральнага курсу, мэтай якога з'яўляецца адраджэнне моцнай дзяржавы, умацаванне адзінства Расіі», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Мядзведзева прадоўжыцца эфектыўная рэалізацыя прынятых нацыянальных праектаў і эканамічных праграм, якія адпавядаюць у першую чаргу інтарэсам простых людзей.

«Беларусы шчыра рады поспехам, дасягнутым Расіяй за апошні час. Перакананы, аб'яднанымі намаганнямі мы зможам надаць новы дынамізм беларуска-расійскім інтэграцыйным працэсам, стварыць аснову для далейшага павышэння дабрабыту грамадзян нашых краін, разам выстаяць у свеце ўзрастаючых пагроз і выклікаў», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

## Прэзідэнт Беларусі накіраваў пасланне Уладзіміру Пуціну

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў пасланне дзеючаму Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну.**

«2 сакавіка 2008 года стала важнай датай у сучаснай гісторыі Расіі. У гэты дзень грамадзяне Вашай краіны прагаласавалі за захаванне стабільнасці і далейшае правядзенне рэформаў, накіраваных на ўмацаванне расійскай дзяржаўнасці. Адзінадушны выбар з'яўляецца пераканаўчым прызнаннем грамадствам праводзімых Вамі палітычных і сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў», — гаворыцца ў пасланні.

«У многім дзякуючы Вашай дзейнасці Расія адраджаецца. Расце жыццёвы ўзровень народа, павышаецца аўтарытэт краіны на сусветнай арэне», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Я высока цаню адносіны даверу, узаемнай павагі, якія склаліся паміж намі, і заўсёды буду рады бачыць Вас на беларускай зямлі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Спадзяюся, Ваш вялікі грамадска-палітычны вопыт, багатыя веды і ў далейшым будуць прыносіць карысць Расіі, яшчэ не раз паслужаць нашай агульнай справе — саюзнаму будаўніцтву».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Надзяліць Канстытуцыйны суд дадатковымі паўнамоцтвамі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным надзяліць Канстытуцыйны суд дадатковымі паўнамоцтвамі. Аб гэтым ён заявіў, прыводзячы да прысягі суддзяў КС.**

«Трэба гаварыць не толькі пра кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве, але і пра новыя сферы дзейнасці суда», — падкрэсліў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, надзяленне суда дадатковымі паўнамоцтвамі дасць магчымасць вырашаць самыя складаныя юрыдычныя пытанні, якія непасрэдна звязаны як з правамі і законнымі інтарэсамі грамадзян, так і з работай дзяржаўных органаў.

Кіраўнік дзяржавы прыняў прысягу шасці суддзяў Канстытуцыйнага суда, пасля чаго ўручыў новым суддзям падарункавы экзэмпляр Канстытуцыі. Прэзідэнт адзначыў, што ў новасфарміраваны склад суда ўвайшлі высокакваліфікаваныя юрысты, якія карыстаюцца заслужанай павагай у краіне. «Мы чакаем ад вас эфектыўнай працы па ажыццяўленні канстытуцыйнага кантролю, адказнага, абдуманага і ўзважанага падыходу да прыняцця рашэнняў», — сказаў беларускі лідар, звяртаючыся да суддзяў. «Будзьце верныя прынесенай прысязе, прынцыпам судзейскага абавязку, прафесійнаму гонару і адказнасці перад беларускім народам. Заўсёды памятайце, што няўхільнае выкананне палажэнняў Канстытуцыі — гэта залог палітычнай стабільнасці грамадства і ўстойлівага развіцця дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Канстытуцыйны суд абнавіўся, аднак тут не адбылося «ніякай кардынальнай ломкі, практычна палавіна складу суддзяў захавалася». Важным, на думку кіраўніка дзяржавы, з'яўляецца і тое, што «ў складзе суда ёсць жанчыны, а гэта надае стабільнасць любой структуры».

**БЕЛТА.**

Падрабязнасці

## ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ЦЭНЫ — НЕ НІЖЭЙШЫЯ

**Як паведаміла днямі «Звязда», з 25 лютага ў Беларусі павышаны закупачныя цэны.**

Цяпер за малако павінны плаціць: першага гатунку — 660 рублёў, другога гатунку — 605 рублёў за літр. Свініну першай катэгорыі павінны закупляць па 4011 рублёў, другой катэгорыі — 3879, трэцяй — 3462 рублі за кілаграм жывой вагі. Калі гаварыць пра буйную рагатую жывёлу, дык для вышэйшай укормленасці, напрыклад, закупачная цана ўстаноўлена ў памеры 2729 рублёў, сярэдняй укормленасці — 2158, ніжэйшай за сярэднюю — 1271 рубель за кілаграм жывой вагі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Традыцыі

## Масленку гулялі, вясну гукалі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Гуканне вясны» — адно з народных святаў, якое спрадвеку адзначалі ў вёсцы Лаўніца Барысаўскага раёна. Захавалася яно дзякуючы народнаму фальклорнаму калектыву «Лаўнічанка», якім ад заснавання кіруе Ганна Мікалаеўна Казлова. «Калісьці гуканне адбывалася на высокай «кузьмовай гары», а цяпер мы святкуем ў цэнтры вёскі, каля Дома фальклору», — кажа кіраўнік калектыву. Удзельнікамі свята «Масленіца па-лаўніцку», якое прайшло гэтымі днямі, былі ўсе жыхары старажытнай вёскі на беразе ракі Бобр.**

## УВЕСЬ ТЫДЗЕНЬ — З БЛІНАМІ

Да Вялікага посту трэба паспець наесціся, нагуляцца і пазбавіцца крыўдаў

**«Вось прыйдзе Масленіца, тады і — ф'юць!» — абмяркоўвалі героі аднаго вядомага мультфільма лёс масла. Цяпер самы раз даставаць яго запасы і гатаваць бліны — многа-многа бліноў, каб хапіла на ўвесь святочны тыдзень. Бо, як і належыць, за 7 тыдняў да Вялікадня і за тыдзень да Вялікага посту — у праваслаўных хрысціян пачалася Масленіца, якая сёлета прыпадае на 3—9 сакавіка. На працягу гэтых сямі дзён, паводле звычаяў, заведзена есці бліны і хадзіць у госці.**

У нашых продкаў яшчэ да пачатку масленічнага, або сырнага, тыдня існаваў звычай «цягнуць калодку». У час паміж Калядамі і Масленіцай было дазволена жаніцца, а калі нехта з маладых хлапцоў гэтага не паспяваў — яму прызначалі «пакаранне». Жанчыны з песнямі хадзілі па вёсцы і цягнулі за сабой «калодку» — абвязанае вяроўкай бервяно; калі ж ім сустракаўся нежанаты хлопец, вяроўку накідвалі на яго і прымушалі цягнуць калодку, а за вызваленне патрабавалі выкуп. Зрэшты, і незамужнім дзяўчатам было не лягчэй — у адзін з дзён бацька саджаў дачку ў сані і вазіў па сваёй ці навакольных вёсках на агледзіны...

Аўторак — зайгрышы, калі пры магчымасці юнакі і дзяўчаты раніцай каталіся з гары, а потым хадзілі ў госці частавацца блінамі. З катаннем сёлета цяжкавата, але гасціннага прыёму сяброў і сваякоў ніхто не адмяняў. У сераду, на «ласуху», цешчы запрашаюць зяцёў на бліны, прычым без другой палавінкі (разам наведваюцца ў госці толькі маладыя пары, шлюбу якіх яшчэ не споўніўся год).

На поўную моц свята разгортваецца з чацвярга, калі па народнай традыцыі праца спынялася і адбываліся масавыя гулянні (катанні на конях, танцы і г.д). Пятніцу называюць «цешчынымі вячоркамі» — зяці павінны аддзячыць цешчу і пачаставаць блінамі ў адказ. На суботу прыпадаюць «залвічыны пасядзелкі», калі маладыя нявесткі запрасяць да сябе заловак і адораць іх падарункамі. Нарэшце, у нядзелю, перад пачаткам Вялікага посту, ідзе даравальная бяседа: лічыцца, што пачынаць пост трэба з чыстым сумленнем, таму неабходна папрасіць прабачэння ва ўсіх, каго свядома ці выпадкова чалавек пакрыўдзіў за год, а таксама і самому прабачыць мінулыя крыўды. У нядзелю звычайна ладзіцца шчодрая святочная вячэра, праходзяць гулянні, падчас якіх спальваецца чучала Зімы або Масленіцы (разам з якім кожны чалавек можа спаліць непатрэбную рэч або стужку, што сімвалізуе грахі), водзяць карагоды, зазываюць вясну песнямі і г.д.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ХЛЕБ ПАДАРАЖЭЎ

**На 2,5—3 працэнты ў залежнасці ад гатункаў павялічаны гранічныя адпускныя цэны на пшанічную муку для хлебапячэння ў Беларусі, паведамілі ў Міністэрстве эканомікі краіны.**

Адпускныя цэны павялічаны з 28 лютага. Адпаведнае рашэнне прынята ў сувязі з нізкай рэнтабельнасцю і стратнасцю вытворчасці мукі пшанічнай для хлебапячэння, што стала вынікам росту кошту паліўна-энергетычных рэсурсаў і частковай закупкай імпартнай пшаніцы па сусветных цэнах, узровень якіх летась павысіўся значна. Улічваючы тое, што сыравіна для вытворчасці хлеба і хлебабулачнай прадукцыі падаражэла, а таксама нізкую рэнтабельнасць згаданай вытворчасці, пастановай Міністэрства эканомікі ад 26 лютага прадугледжана і павелічэнне з 28 лютага гранічных адпускных цэнаў на дадзеную прадукцыю на 1 працэнт. Павелічэнне адпускных цэнаў на канкрэтныя найменні хлеба і хлебабулачных вырабаў не павінна перавышаць зацверджаных памераў змянення гранічных цэнаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Канферэнц-зала

## МІНІСТЭРСКІ МАРШРУТ

### КІРАЎНІК МУС ПЛАНУЕ ПРАЙСЦІ ЗА 1 ДЗЕНЬ 100 КМ

**Сёння ў нашых вартавых правапарадку свята. Па традыцыі з нагоды Дня беларускай міліцыі з журналістамі сустрэўся міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў.**

Кіраўнік МУС падкрэсліў, што сітуацыя ў краіне застаецца стабільнай. Летась у Беларусі з разліку на 100 тысяч насельніцтва было зарэгістравана 1854 злачынствы. Для параўнання, у Літве гэты паказчык складае 2179, у Польшчы — 2928. Адметна, што ў нашай краіне не толькі змяншаецца колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, але і паляпшаецца іх выкрыванне. У мінулым годзе было раскрыта больш за 90 працэнтаў памянёных парушэнняў закона. Апроч таго, у 2007 годзе актыўна расследаваліся злачынствы мінулых гадоў. Напрыклад, былі ўстаноўлены вінаватыя ва ўчыненні 39 забойстваў, 24 згвалтаванняў, 52 разбояў. Адказваючы на пытанне «Звязды», Уладзімір Навумаў паведаміў, у прыватнасці, што летась беларускім сышчыкам удалося раскрыць «гучнае» заказное забойства, учыненае ў Мінску ў 90-х гадах. Праўда, ад падрабязных каментарыяў кіраўнік МУС устрымаўся, спаслаўшыся на таямніцу следства. Ён толькі паведаміў, што ў бліжэйшы час гэтая «рэзанансная» справа будзе перададзена ў пракуратуру.

**Больш за 85 працэнтаў беларусаў станоўча ацэньваюць дзейнасць органаў унутраных спраў.**

Міліцыі таксама ўдалося ўстанавіць месцазнаходжанне больш чым 8 тысяч злачынцаў, якія хаваліся ад суда і следства і 7 тысяч зніклых без вестак асобаў.

Аналізуючы сітуацыю на дарогах краіны, Уладзімір Навумаў падкрэсліў, што большасць аварый здараюцца па віне «ліхачоў», пешаходаў, якія не абазначаюць сябе флікерамі і пераходзяць вуліцы і дарогі ў забароненых месцах. Міністр Навумаў паведаміў, што дзесьці напрыканцы красавіка ў МУС Беларусі з'явіцца верталёт французскай вытворчасці. «Паветраныя інспектары» ДАІ будуць патруляваць самыя праблемныя аўтамагістралі. Увогуле, у Нацыянальным аэрапорце плануецца стварыць цэлую міліцэйскую эскадрыллю, якая будзе налічваць 7 верталётаў. Аднак на гэта, паводле слоў Уладзіміра Навумава, спатрэбіцца прыкладна 5 гадоў.

А вось на распрацоўку біяметрычных пашпартоў беларускім вучоным і міліцыянерам дастаткова будзе ўсяго 6 месяцаў. Іншая справа, што гэта для Беларусі пакуль не актуальна. Аднак як толькі, напрыклад, Еўрасаюз вылучыць падобныя патрабаванні для нашых грамадзян, то, паводле слоў Уладзіміра Навумава, МУС Беларусі аператыўна вырашыць гэтую праблему. Міністр таксама парэкамендаваў беларусам, якія мелі нават нейкія непаразуменні з прадстаўнікамі праваахоўных ці падатковых органаў, перад тым як накіравацца за мяжу, патэлефанаваць у падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі, каб высветліць, ці не трапілі яны ў «спіс невыязных». Як адзначыў Уладзімір Навумаў, памянёныя спісы ўвесь час мяняюцца, хтосьці трапляе ў адмысловую базу звестак, кагосьці выкрэсліваюць.

Кіраўнік МУС у чарговы раз заявіў, што галоўным крытэрыем працы беларускай міліцыі з'яўляюцца не статыстычныя паказчыкі, а меркаванне насельніцтва. Паводле апошніх сацыялагічных апытанняў, больш за 85 працэнтаў апытаных грамадзян далі станоўчую адзнаку дзейнасці органаў унутраных спраў.

Так што сёлета беларускія міліцыянеры сустракаюць сваё прафесійнае свята ў добрым настроі. Нават злачынцы, як адзначыў Уладзімір Навумаў, 4 сакавіка імкнуцца не парушаць закон. Прынамсі, пра гэта сведчыць аператыўная зводка, якая ў гэты дзень фіксуе менш злачынстваў, чым звычайна. Для самога міністра ўнутраных спраў святочны дзень будзе адметны дадатковай працоўнай нагрузкай. Да таго ж Уладзімір Навумаў 5 сакавіка правядзе ў беларускай сталіцы перамовы з кіраўнікамі Міжнароднай федэрацыі хакея. Нагадаю, што кіраўнік МУС узначальвае Беларускую федэрацыю хакея. Адказваючы на пытанне «Звязды» аб тым, якіх вынікаў Уладзімір Навумаў чакае ад памянёных перамоў, ён заявіў: «Я хацеў бы пераканаць нашых гасцей, што Мінск — гэта той горад, які ў 2014 годзе можа прыняць чэмпіянат свету па хакеі».

І яшчэ. Напрыканцы прэс-канферэнцыі галоўны беларускі міліцыянер паведаміў, што 4 мая гэтага года збіраецца здзейсніць пешае падарожжа. Генерал Навумаў плануе прайсці за 1 дзень 100 км.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

Сям'я

## Будуць прыняты меры па ўзмацненні дзяржпадтрымкі сем'яў пры нараджэнні трайнятаў і больш дзяцей

**У Беларусі будуць прыняты меры па ўзмацненні дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі сем'яў пры нараджэнні трайнятаў і больш дзяцей. Адпаведны праект пастановы Савета Міністраў падрыхтаваны па даручэнні Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі.**

«Пабуджальным матывам» для распрацоўкі дадатковых мераў падтрымкі беларускім сем'ям, у якіх з'явіліся на свет адразу тры і больш малышоў, стаў зварот да кіраўніка дзяржавы сям'і мінчан. Бацькі трайнятаў акцэнтавалі ўвагу Прэзідэнта на тых цяжкасцях, з якімі сутыкаюцца такія шматдзетныя сем'і ў сувязі з доглядам дзяцей.

Як паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Мінстэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Шаметавец, у самы кароткі тэрмін быў распрацаваны праект пастановы ўрада. Дакумент змяшчае дзве галоўныя навацыі. Па-першае, прапануецца прадастаўленне бясплатных паслуг няні прадоўжыць да таго, як дзецям споўніцца тры гады (цяпер — два гады). Па-другое, плануецца ўстанавіць права на бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця без уліку сярэднедушавога даходу сям'і ў месяц (паводле дзеючага заканадаўства бясплатнае дзіцячае харчаванне выдзяляецца з улікам сямейнага даходу).

Трэба адзначыць, што ў Беларусі з кожным годам павялічваецца колькасць блізнятаў, а 2007 год стаў у гэтых адносінах рэкордным: з'явілася на свет 965 двайнятаў, 20 трайнятаў і 1 чацвярня.


ОАО «Управление механизации № 91»

**извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 28 марта 2008 года в 16 часов по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11. Регистрация участников начинается с 14 часов 45 минут по предъявлении документа, удостоверяющего личность.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году и основных направлениях деятельности Общества на 2008 год.
2. Утверждение годового бухгалтерского отчета и баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2007 год.
3. Утверждение порядка распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2007 год. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2008 году.
4. О работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2007 году. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

**Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91».**

Тел. 017 226 77 63.

УНН 100055130


## З ЗОЛАТАМ У БАЛЬНІЦУ

У Брэсцкай цэнтральнай гарбальніцы дзве жанчыны прадавалі медыкам залатыя вырабы. Пяць пярсцёнкаў не мелі проб і пайшлі за 300 тысяч рублёў. Калі ж міліцыянеры абшукалі жанчын, то знайшлі пры іх 285 ювелірных вырабаў на 74 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) повторно проводят открытый аукцион

**по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.**

| Номер лота | Номер машиноместа | Общая площадь, кв. м | Начальная цена, бел. рубли | Сумма задатка, бел. рубли |
|---|---|---|---|---|
| 4. | 4. | 11.9 | 8 499 992 | 849 999 |
| 5. | 5. | 11.9 | 8 499 992 | 849 999 |
| 9. | 13. | 12.2 | 8 714 277 | 871 428 |
| 11. | 17. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 12. | 20. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 14. | 22. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 15. | 27. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 16. | 28. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 17. | 29. | 11.7 | 8 357 135 | 835 714 |
| 18. | 30. | 11.7 | 8 357 135 | 835 714 |
| 27. | 45. | 10.6 | 7 571 421 | 757 142 |
| 28. | 46. | 10.2 | 7 285 707 | 728 571 |

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. ***Аукцион состоится 14 марта 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.*** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 13 марта 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе указан в условиях проведения аукциона. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.02.2008.

Телефоны для справок: 227 48 36, 227 40 22 – УП «Минский городской центр недвижимости»

УНП 190398583.


Жыхары Сочы галасавалі за сімвал зімовых Алімпійскіх гульняў-2014. Ім стаў сімвал Чорнага мора — дэльфін. Сярод прэтэндэнтаў былі Дзед Мароз, сняжынкі на лыжах і белы мядзведзь.

Погляд

## РАСІЯНЕ ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА СТАБІЛЬНАСЦЬ

Бліжэйшыя чатыры гады ўнутраную і знешнюю палітыку Расіі будзе вызначаць тандэм Мядзведзеў — Пуцін. Цікава, што з гэтага атрымаецца?





**Згодна з папярэднімі дадзенымі Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі, у прэзідэнцкіх выбарах упэўнена і з вялікім адрывам лідзіруе кандыдат ад партыі ўлады «Адзіная Расія» Дзмітрый Мядзведзеў — 70,23 працэнта. За ім ідуць старшыня КПРФ Генадзь Зюганаў — 17,76 працэнта і кіраўнік ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі — 9,37 працэнта.**

Па вялікім рахунку, нічога новага ў гэтым раскладзе няма. Прыблізна такія вынікі неаднойчы прадказваліся вядомымі расійскімі і замежнымі аналітыкамі і назіральнікамі, падобныя лічбы былі атрыманы ў ходзе сацыялагічных апытанняў прыкладна за два тыдні да галасавання. Нельга не звярнуць увагу на тое, што вынікі нядаўніх парламенцкіх выбараў у Расіі ў снежні мінулага года (іх тады параўноўвалі з неафіцыйным рэферэндумам па палітычнаму і эканамічнаму курсу прэзідэнта Пуціна) блізкія да папярэдніх даных Цэнтральнай выбарчай камісіі па галасаванні ў мінулую нядзелю. Паглядзіце, тады «Адзіная Расія» набрала 64,1 працэнта, КПРФ — 11,6 працэнта, ЛДПР — 8,2 працэнта. Паводле ацэнак маскоўскіх палітолагаў, сёлетняя прэзідэнцкая кампанія была сумнай, ціхай, адносна карэктнай (за выключэннем традыцыйнага хамства і хуліганскіх паводзінаў Жырыноўскага ў адносінах да сваіх апанентаў) і без інтрыгі з загадзя вядомым пераможцам. Самыя жорсткія праціўнікі тандэма Мядзведзеў — Пуцін назвалі гэту выбарчую кампанію «выбарамі без выбару». І ўзгадвалі: куды ёй да драматычнай і жорсткай барацьбы Ельцына і Зюганава, калі ўся краіна не адзін месяц была ў напружанні.

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

## ЗДАРОВЫ КАЛГАС

### У БЯЛЫНІЦКАЙ ГАСПАДАРЦЫ ЗАЦВЕРДЗІЛІ ПРАГНОЗ НА АДМОВУ АД КУРЭННЯ

**На справаздачна-выбарчым сходзе працоўнага калектыву АПК «Калгас Радзіма» вяскоўцы прагаласавалі за перспектыўныя паказчыкі не толькі збожжа і малака, але і колькасці людзей, якія сёлета развітаюцца са шкоднай звычкай.**

**Сёння тут не кураць 230 чалавек — 64 працэнтаў работнікаў. Да канца года гэты паказчык павінен павялічыцца яшчэ на 15 працэнтаў. А значыць, падлічылі ў «Радзіме», 58 вяскоўцаў сёлета павінны кінуць курыць. Гэта запісана ў рашэнні агульнага сходу.**

### Прыклад лідара

Сваю кампанію за здаровы лад жыцця кіраўнік «Радзімы» Аляксандр Лапацентаў пачаў яшчэ 14 гадоў таму. Сам ён курыў цыгарэты са студэнцкіх часоў, і курэнне цягнулася два дзесяткі гадоў. Цяпер, прызнаецца Лапацентаў, ледзь не з дрыжыкамі ўзгадвае страх перад першай ранішняй зацяжкай, бо ногі станавіліся ватныя, а самому — млосна. А потым ішоў на нараду на мехдвары, дзе ўсе курылі прама за рабочым сталом, і праз 15 хвілін адзін аднаго не бачылі ў клубах дыму...

«Калі б цяпер закурыў, то, верагодна, памёр бы!» — смяецца Аляксандр Міхайлавіч.

Днямі споўнілася 27 гадоў, як Лапацентаў узначальвае «Радзіму». Ён — цікавая асоба, валявы кіраўнік, сапраўдны лідар. Калі на пачатку 1990-х гадоў дэманстратыўна кінуў курыць і заклікаў калег зрабіць тое ж самае, да яго далучылася больш за 30 чалавек.

— З тых часоў і пайшла хваля некурэння, — узгадвае Аляксандр Міхайлавіч. — Памятаю, што тады да мяне прыходзілі калгасніцы і прасілі, нібыта экстрасэнса, паўплываць на мужа альбо сына, каб кінуў курыць. Але ўвогуле гэта быў першы крок да дысцыпліны, калі пайшлі пасляперабудовачныя хістанні. Хто прапіваў калгасы, хто прыватызаваў, а ў нас стаяла задача — захаваць гаспадарку. І я сёння ўдзячны людзям, што тады мы зразумелі адзін аднаго і пакрочылі правільным шляхам.



**Аляксандр Лапацентаў 14 гадоў таму кінуў курыць і заклікаў узяць з яго прыклад: цяпер у «Радзіме» не кураць 230 чалавек.**

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

ISSN 1990 - 763X

08042

9771990763008

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.03.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| Валюта | Курс |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 3 258,61 |
| 1 латвійскі лат | 4 671,96 |
| 1 літоўскі літ | 943,84 |
| 1 чэшская крона | 129,81 |
| 1 польскі злоты | 919,55 |
| 1 расійскі рубель | 89,42 |
| 1 украінская грыўня | 425,15 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| Валюта | Курс |
|---|---|
| USD | 24,0103 |
| 10 UAH | 47,1077 |
| 1000 BYR | 11,1793 |
| EUR | 36,5125 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 3.03.2008 г.)*

| Валюта | Курс |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Спорт-тайм

### Узлёт Чайкі

Беларуска Вікторыя Чайка выйграла залатыя медаль на чэмпіянаце Еўропы ў стральбе з пнеўматычнага пісталета з дыстанцыі 10 метраў. Спартсменка на тры ачкі апярэдзіла Ніно Салуквадзэ з Грузіі.

### Баксёрскія ліцэнзіі

На адборачным турніры да Алімпіяды-2008, які праходзіць у Італіі, тры з адзінаццаці беларускіх баксёраў заваявалі пропускі ў Пекін. Для гэтага патрэбна было прабіцца ў галоўны паядынак спаборніцтваў, што зрабілі Магамед Нурудзінаў (вага да 69 кг) і Віктар Зуеў (91 кг), якія сталі пераможцамі ў сваіх баях. Алімпійская пуцёўка і ў сярэбранага прызёра Рамазана Магамедава (вага да 81 кг). У кроку ад набыцця ліцэнзіі спыніўся ўладальнік «бронзы» Антон Бекіш (48 кг). Сярод прадстаўнікоў 40 краін беларуская зборная заняла другое месца ў медалёвым заліку, саступіўшы ўкраінцам.

### Жукаву ацанілі

Беларуская грацыя Іна Жукава тройчы вызначылася на этапе гран-пры па мастацкай гімнастыцы ў Маскве. У фіналах практыкаванняў у асобных відах яна стала другой з абручом і трэцяй са скакалкай і са стужкай.

### Футбалісты — у плей-оф ЧС

Выйграўшы ў заключным матчы ў Чарнагорыі (5:0) зборная Беларусі па міні-футболе пад кіраўніцтвам Валерыя Дасько заняла першае месца ў 5-й групе адборачнага турніру да ЧС-2008 у Румыніі і выйшла ў плей-оф, які адбудзецца з 29 сакавіка па 16 красавіка.

### Касціцын перакрыў вынік Цыплакова

Хакеіст Андрэй Касціцын пабіў рэкорд Уладзіміра Цыплакова ў наймацнейшай лізе планеты, на рахунку якога ў першынстве НХЛ-1997/1998 было 18 галоў за «Лос-Анджэлес». Форвард «Манрэаль Канадзіенс» закінуў днямі сваю 19-ю шайбу ў гульні з «Бафала».

### Самыя дарагія

Бразільскі паўабаронца Кака прызнаны самым высокааплатным футбалістам у свеце па версіі часопіса Futebol Finance. У дзесятку ўвайшлі Рыкарда Кака — 9 млн еўра ў год, Раналдзіньё — 8,52 млн, Фрэнк Лэмпард — 8,16 млн, Джон Тэры — 8,16 млн, Фернанда Торэс — 7,92 млн, Андрэй Шаўчэнка — 7,8 млн, Міхаэль Балак — 7,8 млн, Крышціяну Раналду — 7,68 млн, Цьеры Анры — 7, 68 млн, Сцівен Джэрард — 7,68 млн еўра.

## Простыя рэчы

# Вясло

**Сямідзесятыя гады. Самы пачатак іх. І ў нашу правінцыю дасталіся перанасныя магнітафоны. Іх няшмат. Але вечаровай парой выйдзеш у цэнтр, у гарадскі сквер — чуецца музыка гэтых самых перанасных магнітафонаў. І практычна з кожнага — хрыплаваты і непаўторны Высоцкі. Як ён спяваў пра статую, якую замежны турыст спрабаваў вывезці з нашай краіны, выдзеўбшы ў зубе дупло. Не атрымалася, пільны мытнік выняў з гэтага дупла статую. Праўда, толькі без весла.**

Статуя з вяслом… Гэта наша эпоха. Скульптура жанчыны альбо мужчыны з вяслом у руках абавязкова павінна была ўпрыгожваць тагачасны парк культуры і адпачынку. А што Высоцкі? Ён прыкмеціў нашу тагачасную паўсюльную манументальную каштоўнасць. Ён усміхнуўся разам з намі над гэтым. І ўсміхнуўся прарочa. Фізічная культура і спорт засталіся, але не ў сімвалічных іх выявах сямідзесятых гадоў, а ў рэальных справах сённяшняга дня. Няма гэтых статуй з вяслом у Пастаўскім гарадскім парку. Але затое ёсць месцы, дзе моладзь, і не толькі моладзь, можа займацца любімымі відамі спорту. Ёсць у Паставах каманды, якія годна трымаюць сваю марку на рэспубліканскім узроўні.

А статуя з вяслом… Ведаеце, зусім нядаўна давялося пабачыць яе на беразе аднаго са шматлікіх азёраў нашага краю. Камерсант выкупіў яе некалі, перавёз, паставіў на тэрыторыі сваёй дачы. І глядзіцца! На зялёным мурагу, над сінявой чыстага яшчэ возера — глядзіцца.

Калі табе за пяцьдзесят — успамінаеш з асалодай мінулае ды маладое. У тых жа сямідзесятых, а, магчыма, у васьмідзесятых была ў нас папулярная пласцінка з запісамі песень кампазітара Давіда Тухманава. Называлася яна, наколькі памятаю, «На хвалі маёй памяці». Вершы ён браў з розных эпох і розных паэтаў. Але папулярнасць гэтых пласцінак была вялікай. Сёння ўжо, відаць, няма і тых пласцінак, і нават тых прайгравальнікаў, на якіх мы слухалі песні. А вось адна песня помніцца. Студэнт адпраўляецца па навуку ў Еўропу, развітваецца са сваімі сябрамі і сяброўкамі:

*Вот стою, держу весло,*
*Через миг отчалю.*
*Сердце бедное свело*
*Грустью и печалью...*

Як нам тады спявалася, як неапраўдана сумавалася! А сапраўдны сум па пражытым і па нечым нязздейсненым прыходзіў толькі пасля. У васьмідзесятых, выдаючы чарговы альманах пастаўскіх паэтаў «Рунь», быў зачараваны вершам Яўстафія Абрамовіча (ужо нябожчыка) «Гарлачыкі». Гэта нарачанскія ўспаміны паэта аб юнацтве, аб тым, што ніколі не вернеш, але ж было, было...

*Да гэтых кветак,*
*што дзівоснымі*
*З тых непаўторных дзён заву,*
*У светлых снах махаю вёсламі,*
*Але ніяк не даплыву.*

Увогуле, у беларускай паэзіі вясло мела вельмі часта сімвалічнае значэнне.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мой настаўнік, паэт Сяргей Панізнік напісаў:

*Час! Вясна бярэ вясло:*
*адраджае вершамроі,*
*словалюбныя настроі,*
*любароднае святло.*

Яно, вясло, — і простая рэч. І разам з тым нешта, што дазваляе трымаць накірунак, супрацьстаяць цячэнню. Калі яго, весла, няма, то бывае вельмі цяжка. Вось у Аляксея Пысіна, досыць забытага, але цудоўнага нашага паэта, які аднойчы прагаварыўся пра сябе — «нібы патрыцый на выгнанні». Дык вось у яго:

*А няма ні лодкі, ні парома,*
*Ні абломка слізкага весла.*

Напісаў гэтыя радкі і ўзгадалася зноў жа з сямідзесятых. Вясляр. Давялося і мне пабыць крыху ў гэтай якасці. Не проста ў лодцы на шматлікіх нашых азёрах у час адпачынку, а рыхтуючыся прафесійна. Захаваўся дакумент. 15 кастрычніка 1973 года я быў залічаны курсантам у Віцебскі марскі клуб. Вучыўся на электрамеханіка, але рыхтавалі нас для службы на флоце. Такім чынам, і марская падрыхтоўка на Дзвіне. Навучалі нас плаваць на ялах. Гэта ад галандскага — jol. Ял — 2—8-вёсельная адносна кароткая і шырокая суднавая шлюпка з транцавай (плоскай) кармой. У нас былі шасцівёсельныя. Шэсць чалавек браліся за вёслы, а сёмы сядзеў на рулі. Вось, сапраўды, слізкае, як у Пысіна, вясло. На Дзвіне халодны вецер, дождж, часам і снег. А ты абедзвюма рукамі трымаеш гэта вялікае вясло, вяслуеш па камандзе. Вясло абмярзае, выслізгвае з рук. Але вяслуй! Трэба выканаць нарматыў, каб атрымаць нейкі, самы неабходны будучаму мараку, разрад. Самае цікавае было ў тым, што, адпраўляючыся на Дзвіну, сядаючы за вялікія вёслы яла, мы не мелі ні спецыяльнай вопраткі, ні ботаў, і спаборніцтвы на гэтых вёслах праводзіліся без ніякіх афіцыйных прадстаўнікоў. Нашы вынікі, з секундамерамі ў руках, фіксавалі выкладчыкі клуба. Але разрады мы атрымалі, атрымалі і адпаведныя пасведчанні аб заканчэнні Марскога клуба. Ды толькі ўсю нашу каманду адправілі служыць у пяхоту. Такі быў час, такая эпоха, як сказаў некалі паэт, што пажадаў застацца без імені, а толькі з псеўданімам — Лысагорскі.

Вяславаць мне ў жыцці даводзілася нямала. Ды ў нашым рачным ды азёрным краі — інакш нельга. Бывала, што і ў час сваіх журналісцкіх камандзіровак дастаўляўся да патрэбнай мне мясціны на лодцы. Было. Гаспадар яе ўручыў мне вясло, а дакладней простую драўляную рыдлёўку, не такую і доўгую — трэба нахіляцца над стромкай у гэтым месцы Дзісной — «Вяслуй!»

І веславаў.

Але ёсць некалькі цудоўных нарачанскіх успамінаў. Тады крыху прыхапіла сэрца. І гады з чатыры запар я атрымліваў пуцёўкі ў Дом адпачынку «Нарач». Як правіла даставалася мне гэта ласа ў восеньскі час — кастрычнік—лістапад. Але ж тады выпадалі цудоўныя цёплыя восені. І вось бярэш на лодачнай станцыі лодку. Прымаеш вёслы. Яны тады на Нарачы былі адметныя: доўгія, драўляныя, з рыдлёўкамі, нібыта лыжкі. Рыдлёўкі з пластмасы. Такім вяслом грабанеш — коцішся па спакойнай нарачанскай вадзе на шмат дзесяткаў метраў. Я ведаў, што многія беларускія паэты і пісьменнікі ў свой час здзяйснялі своеасаблівы хадж: абыходзілі нашу жамчужыну пехам. У мой час гэта было ўжо не так і проста. Панабудавалі шмат санаторыяў, дамоў адпачынку, тургасцініц, кемпінгаў. Пазагароджвалі возера. А я вырашыў абплысці яго на вёслах. Дарэчы, у старой беларускай мове ёсць і такое слова — веслаўка. Каментарыяў не патрэбна.

І вось у мяне два вяслы, ходкая, лёгкая лодка, спадарожніца. Між іншым, стартаваў прыкладна ад таго месца, дзе некалі былі домікі для адпачынку супрацоўнікаў «Звязды». Не ведаю, ці захаваліся яны сёння.

Праплылі мы да Наносаў, праплылі далей, туды, дзе нашы славутыя санаторыі. Праплылі практычна да таго перашыйку, які раздзяляе Нарач і Мястра. І тут узнялася хваля. Мая спадарожніца прадбачліва выйшла на бераг і рушыла да аўтобуснага прыпынку, каб вярнуцца назад, у Дом адпачынку.

А я аддаўся волі гэтых самых, нечаканых нарачанскіх хваляў. Лодка лёгкая, пустая. На вадзе ў такі час няўстойлівая. Я практычна не веславаў, а толькі вёсламі стараўся накіраваць лодку так, каб хвалі білі ў карму.

І гнала ж мяне! Тут успомніліся ўсе гісторыі пра нарачанскіх рыбакоў, якія знаходзілі свой супакой на дне нашага беларускага мора, пра тое, што разгневаная Нарач часам магла выкінуць на бераг столькі рыбы, што ў галодны год хапала на харчаванне жыхарам навакольных вёсак.

...Мяне літаральна ўдарыла аб прычал у тым месцы, дзе браў у арэнду лодку. Дзяжурны хуценька прывязаў яе да кала, выцягнуў вёслы.

— Дзякаваць Богу, ты апошні.

Я ўскінуў вёслы на плячо, занёс іх у бытоўку. Мы яшчэ пасядзелі некалькі хвілін, пакурылі.

— Мора...

— Мора, не мора, але бывае. — І мой суразмоўца кінуў позірк у кут, дзе ляжала некалькі паламаных вёслаў.

Ніколі не даводзілася самому выrабляць вёслы. Патрэбна для гэтага сваё, «лёгкае» дрэва, ды і спрыт адпаведны. А вось уключыны ў лодцы, прыстасаванні для замацавання вясла на борце лодкі, даводзілася рамантаваць неаднойчы. І яшчэ ў іх ёсць адна асаблівасць — рыпяць. Каб не рыпелі, патрэбна адпаведная змазка. Але гэта ўжо з навыкаў браканьераў ці паляўнічых, да якіх, дзякаваць зноў жа Богу, сябе не адношу.

З даўніх часоў вясло было і своеасаблівым узбраеннем не толькі рыбакоў, але і тых, хто вырашаў прагуляцца на лодцы. Помніце, быў у Расіі акцёр-сатырык, сапраўдны мужык, які сваю кар'еру пачынаў з аповедаў аб тым, як ён ішоў з лазні і... нехта яго даганяў з вяслом.

А завяршыць аповед пра простую рэч — вясло, дазвольце сваім вершам, крыху тужлівым.

*Рэчка майго маленства*
*(Колькі разоў патанаў):*
*Вясна, ручаёў шаленства —*
*Вясло дастае да дна.*
*Вербы майго дзяцінства*
*(Не помню мацней за іх)*
*У самазгубным адзінстве*
*Хіляцца ў хвалі ракі.*
*Толькі неба скрозь кроны,*
*Неба ў люстэрку вады*
*Глыбокае да бяздоння.*
*Таму і прагнем туды.*

**Алесь КАСЦЕНЬ.**
*Вёска Касцяні Пастаўскага раёна.*

## «ЛЁСАМ ДАРАВАНЫЯ СУСТРЭЧЫ»

**Пад такой назвай у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі з 29 лютага па 2 сакавіка прайшла фотавыстава Алы Ткачэнкі.**

Сто пяцьдзесят фотапартрэтаў вядомых дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі і Расіі, якія дэманстраваліся на выставе, — гэта вынік працы фотамастачкі за апошнія восем гадоў.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



**Ала ТКАЧЭНКА са сваімі работамі.**


## Паритетбанк

### Уважаемые акционеры ОАО «Паритетбанк»!

**27 марта 2008 года в 10.00 часов состоится годовое Общее собрание акционеров банка по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5, ауд. 414 (конференцзал) — ГУ «Республиканский культурно-просветительный центр управления делами Президента Республики Беларусь».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О процедурных вопросах проведения годового Общего собрания акционеров.
2. Об отчете о работе Правления ОАО «Паритетбанк» в 2007 году и задачах на 2008 год.
3. Об отчете о работе Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк».
4. Об отчете Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» о работе за 2007 год.
5. Об утверждении годового баланса, отчета о прибылях и убытках и порядке распределения прибыли за 2007 год.
6. Об избрании Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк».
7. Об избрании Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк».

**Регистрация участников будет осуществляется с 9.20 до 9.50 часов.**

При регистрации акционерам необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность:

- представителям акционеров — документ, удостоверяющий личность, и доверенность;
- руководителям юридических лиц (акционеров) — удостоверение руководителя либо иной предусмотренный законодательством документ, подтверждающий полномочия руководителя.

*С материалами собрания участники смогут ознакомиться по месту проведения собрания одновременно с прохождением регистрации.*

**Телефон для справок: (8 017) 288 49 43.**

*ОАО «Паритетбанк». Лиц. Национального банка РБ № 5 от 27.10.2006 г. УНП 100233809*


## Суб'ектыў

# РОКЕРАЎ КАРАНАВАЛІ, ПРЭМІЮ... ПАХАВАЛІ?

**Сёлетняя «Рок-каранацыя» зноў атрымалася скандальнай. І, магчыма, апошняй**

**«Беларускі аналаг Грэмі», які прайшоў у апошні дзень зімы ў канцэртнай зале «Мінск», атрымаўся вельмі неадназначным. Натуральна, наўрад ці хто стане аспрэчваць заслужаная права «Нейра Дзюбель» на галоўную карону «Гурт года», але вось да самой цырымоніі ў многіх — музычных крытыкаў, журналістаў, дый саміх артыстаў — назапасілася столькі прэтэнзій, што праўдзенне наступнай прэміі зноў пад вялікім пытаннем.**

Пачаць з таго, што заяўлены было традыцыйны спецпрыз ад спонсараў так і не матэрыялізаваўся. З вельмі банальнай прычыны: спонсараў элементарна не знайшлося. Нягледзячы нават на тое, што рок як быццам быў «рэабілітаваны», дапушчаны на афіцыйныя тэлеканалы і ўвогуле паўсюдна, куды толькі праб'ецца. Але, відаць, спрацавала сіла звычкі — лепш пачакаць, паглядзець, як яно станецца.

А сталася ў рэжыме дэжа вю, як быццам ланцуг падзей замкнуўся і пайшоў на другі віток. Узяць той жа «Нейра Дзюбель»: першую рок-карону гурт атрымаў роўна дзесяць гадоў таму, у 1998-м, — заўважым, з рук Уладзіміра Мулявіна. Сёлета — той жа гурт, тая ж карона.

Жаданне зрабіць цырымонію больш фарматнай таксама выклікала дзіўнаватыя адчуванні. Параўнайце: што сабак ды парсюкоў выводзяць на сцэну ўдзельнікі «Рок-каранацыі», што размалёўвае парася ў чырвоны Яўген Булка на чарговай «Песні года». Думаецца, жывёліны ад гэтага больш ці менш рок-н-рольнымі не сталі. Або: сярод гасцей цырымоніі заўважаны модны фатограф і выдавец Юрый Будзько і гламурная гімнастка і тэлевядучая Яўгенія Паўліна. Толькі ў першым выпадку гэта цырымонія «Топ-50 пасляховых і прыгожых» з уручэннем прыгожых дыпломаў, а ў другім — шматпакутная «Рок-каранацыя» і шкляныя сімвалы з айчыннага хрусталю. Знайдзіце на ўдзельнікаў — палова людзей не мае да рок-н-ролу ніякага дачынення. Назавіце проста — «Каранацыя», — прапануе Кася, якая некалькі апошніх гадоў прынцыпова не наведвае цырымонію. З таго часу, як ёй у трэці раз прапанавалі рок-карону, яна лічыць прэмію фарсам.

«Прадынамілі» па розных прычынах цырымонію і некалькі відавочных фаварытаў, якія найбольш яскрава праявілі сябе ў 2007 годзе, у прыватнасці, гурты «J:Морс» і «Ляпис Трубецкой». Першы, як мы ведаем, быў увогуле пазбаўлены прэміі (невядома, хто ад гэтага факта больш страціў). Другі ўсё ж



Экспрэсіі сёлетняй «Рок-князёўне» не пазычаць, а слава — справа нажыўная.



Лявон Вольскі нават у футры а-ля «101 далмацінец» — лепшы выканаўца года.

це дзесяць адрозненняў, як кажуць...

Ну і, вядома ж, асобная песня — пра сістэму судзейства. Хто і як вылучае намінантаў на прэмію года, і чаму ў намінанты трапляюць менавіта гэтыя людзі — суцэльная загадка. Таму і павісае ў паветры рытарычнае пытанне: што, сёлетняе «Адкрыццё года», акцёрскі гурт «Дзецідзяцей» — гэта ўжо таксама рок? Так, у іх добрая, адметная музыка, свая ніша, але — рок? А «J:Морс», які не выйшаў летась за сваёй рок-каронай і таму быў пазбаўлены кароны цяпер — гэта не-рок? Ну, прабачце...

Прынамсі, такія няўцямныя пытанні хвалююць не мяне адну. Паводле слоў колішняй «Рок-князёўны» Касі Камоцкай, да «Рок-каранацыі» ў яе дзве асноўныя прэтэнзіі: незразумелы фармат і арганізацыя журы. «Калі гэта рок, хацелася б, каб гэта быў рок. Паглядзіце на ўдзельнікаў...

перамог у намінацыях «Песня года» і «Кліп года» з кампазіцыяй «Капітал», якая ўжо не адзін раз была адзначана рознымі прэміямі. Праўда, «Ляписов» арганізатары ўсё ж паўшчувалі — маўляў, «спачатку яны пагадзіліся, а потым зрабілі выбар на карысць нейкага карпаратыўніка».

Затое на карысць заяўленага канцэрта зрабілі выбар гурты «Крамбамбуля», «Крама», «Палац». І... засталіся без узнагарод, толькі парадавалі публіку выступленнямі. 10 прызавых намінацый размеркаваліся наступным чынам:

**«Адкрыццё года»** — «Дзецідзяцей»;
**«Прарыў года»** — «Фляус і Кляйн»;
**«Кліп года», «Песня года»** — «Ляпис Трубецкой»;
**«Выканаўца года»** (вызначаўся інтэрнэт-галасаваннем) — Лявон Вольскі;



«Шапка Манамаха» Аляксандру Кулінковічу і не цісне, і не вялікая — у самы раз.

**«Рок-князёўна»** (спецнамінацыя) — вакалістка Tarpach, Zygimont VAZA Вольга Самусік;
**«Праект года»** — «Калыханкі» (Дзіцячы Фонд ААН ЮНІСЕФ);
**«Традыцыі і сучаснасць»** — «OSIMIRA»;
**«Альбом года», «Рок-карона»** — «Нейра Дзюбель»;
спецпрыз ад тэлеканала A-One — «Тройца».

Такім чынам, тройчы ўра новым рок-каралям і няхай жыве на радасць меламанам рок-н-рол. А вось сама прэмія пасля непрацяглай рэінкарнацыі, вельмі падобна, памерла... Ва ўсякім выпадку, у цяперашнім выглядзе. Падводзячы вынікі, галоўны рэдактар партала «Тузін Гітоў» і прадзюсар «Рок-каранацыі» 2005—2007 гг. Сяргей Будкін паведаміў «Звяздзе», што мінулагоднія цырымоніі нават пры наяўнасці спонсараў былі стратнымі, а наконт сёлетняй гаварыць рана — але спонсараў, за выключэннем інфармацыйных, яна ўвогуле не мела. Акрамя таго, прадзюсар зрабіў наступную афіцыйную заяву: «Мы выходзім з ліку арганізатараў і абвяшчаем пра стварэнне сваёй альтэрнатыўнай музычнай прэміі. Якой яна будзе і што з гэтага атрымаецца — пакажа час. Не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Вольгі ЛАСКІ і Пятра ФАМІНА.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.50 | 17.53 | 11.03 |
| Віцебск — | 6.41 | 17.41 | 11.00 |
| Магілёў — | 6.40 | 17.43 | 11.03 |
| Гомель — | 6.35 | 17.42 | 11.07 |
| Гродна — | 7.05 | 18.08 | 11.03 |
| Брэст — | 7.04 | 18.11 | 11.07 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 29 лютага—6 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

*Пр. Архіпа, Багдана, Макара, Максіма, Фёдара, Філімона, Яўгена;*
*К. Люцыі, Казіміра, Яўгена.*

## НАДВОР'Е на заўтра

ВІЦЕБСК 741мм рт.сл. -6..-4°C -1..+1°C
ГРОДНА 748мм рт.сл. -3..-1°C +2..+4°C
МІНСК 737мм рт.сл. -4..-2°C 0..+2°C
МАГІЛЁЎ 741мм рт.сл. -3..-1°C +1..+3°C
БРЭСТ 747мм рт.сл. -3..-1°C +3..+5°C
ГОМЕЛЬ 748мм рт.сл. -3..-1°C +2..+4°C

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

23 гадз., 02 гадз., 05 гадз., 08 гадз., 11 гадз., 14 гадз., 17 гадз., 20 гадз.

**Абазначэнні:**
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— малая геамагнітная бура

### ...у суседзяў

ВАРШАВА +3..+5°C
ВІЛЬНЮС +1..+3°C
КІЕЎ +4..+6°C
МАСКВА -2..0°C
РЫГА 0..+2°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°C

## 4 сакавіка

### Дзве даты

**1917 год** — у Мінску створаны першыя атрады рабочай міліцыі. Прафесійнае свята супрацоўнікаў органаў унутраных спраў Беларусі.



**1990 год** — у Савецкім Саюзе адбыліся першыя альтэрнатыўныя выбары народных дэпутатаў. Цікава, што **ў гэты дзень у 1905** годзе рускі імператар Мікалай ІІ даручыў міністру ўнутраных спраў А. Булыгіну распрацаваць праект аб стварэнні Дзяржаўнай думы.

### Цытата дня:

***«Выбарчы бюлетэнь мацнейшы за кулю».***

**Аўраам Лінкальн (1809—1865), амерыканскі палітычны дзеяч.**

## Усміхнёмся!

Калі мужчына чатыры разы схадзіў налева, то, па законах геаметрыі, ён вернецца.

☺

**— Дарагая! Што табе падарыць на 8 Сакавіка?**
**— Вой, я нават не ведаю...**
**— Тады я даю табе яшчэ адзін год для роздуму.**

☺

Група ўрачоў, якія не бяруць хабар, прапаноўвае па оптавых цэнах цукеркі, кветкі, каньяк, шакаладкі, каву і многае іншае...

☺

**Кот—кату:**
**— Якія ў цябе арыгінальныя сонцаахоўныя акуляры чырвонага колеру...**

**— Гэта мне гаспадар купіў, каб я аўсянку за фарш прымаў.**

☺

Натоўп шалёных дрэў напаў на алкаголіка Сівухіна, які вяртаўся з працы. Адно з дрэў пацярпеламу ўдалося затрымаць і даставіць у аддзяленне міліцыі.







Дарагую матулю і бабулю
**Яўгенію Валяр'янаўну ШМЫГІНУ**
з г.п. Любча сардэчна віншуем
з днём нараджэння.
Здароўя мы жадаем, дабрабыту ў жыцці.
На шчасце, на радасць сто гадоў пражыві.
**Сям'я Мазаль.**

### Лицей БГУ объявляет прием учащихся в 11 классы по профилям: математика (40 мест); физика (40 мест); химия (20 мест); биология (40 мест); филология (40 мест); история (40 мест); экономика (20 мест).

Прием в Лицей БГУ осуществляется по результатам двух письменных вступительных испытаний, которые проводятся 11 мая и 18 мая 2008 года по следующим предметам:

| Профиль обучения | 11 мая | 18 мая |
|---|---|---|
| физика | физика | математика |
| математика | математика | физика |
| химия | химия | математика |
| биология | биология | химия |
| филология | русскийязык и литература | белорусский язык и литература |
| история | история Беларуси | всемирная история (новейшее время) |
| экономика | математика | иностранный язык (английский) |

**Право поступления в лицей БГУ имеют учащиеся**, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и **получившие в текущем году общее базовое образование.** Обучение в лицее БГУ осуществляется на бюджетной основе.

**Без вступительных испытаний зачисляются:**

на соответствующий профиль обучения — победители заключительного этапа республиканской олимпиады (Дипломы I, II, III степени), проводимой Министерством образования Республики Беларусь в текущем учебном году;

в класс математического профиля — победители заключительного этапа республиканской олимпиады по информатике текущего года (Дипломы I и II степени).

Учащиеся, поступающие в лицей БГУ, предоставляют следующие документы: **справку с фотографией, заверенную печатью учреждения образования**; **заявление на имя директора лицея БГУ**. Победители заключительного этапа Республиканской олимпиады текущего года предоставляют **копии Дипломов.**

**Документы принимаются с 24 марта по 30 апреля 2008 г. включительно.**

Во время прохождения конкурсного отбора общежитие иногородним учащимся не предоставляется.

Полный текст правил приема размещен на сайте лицея БГУ: **http://www.lyceum.by.**

**Телефоны для справок: 209 56 19, 209 56 14, 209 56 11, 209 56 02.**
**Адрес: г. Минск, ул. Ульяновская, 8.**

В лицее БГУ работают курсы дистанционного обучения, на которых можно получить консультацию преподавателей лицея о заданиях, предлагавшихся на вступительных испытаниях прошлых лет.

Адреса: сайта дистанционного обучения **http://e-lyceum.by**; электронной почты **lyceum@bsu.by, waraxe@e-lyceum.by.**

УНП 100557342



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 1179. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12